Дзярж. думы, фельетоны з крытыкай мясц. улад за непаладкі гар. гаспадаркі і побыту. Прыхільна пераказвала лекцыі кадэцкіх лідэраў А.І.Шынгарова («Новая Дума і старыя задачы») і П.М.Мілюкова («Нацыянальнасць і дзяржава»), з якімі яны выступалі ў Бабруйску ў 1914. У газеце супрацоўнічаў будучы філосаф-марксіст С.Я.Вальфсон. У літ.-крыт. нататках «Б.ж.» пісала пра творчасць Л.Андрэева, С.Надсана, А.Чэхава. Змяшчала вершы мясц. паэтаў, асвятляла тэатр. і музычнае жыццё Бабруйска.

*У.М.Конан.*

**«БОБРУ́ЙСКИЕ О́ТКЛИКИ»**, штодзённая грамадска-палітычная і літаратурная газета. Выдавалася з 24.8.1911 да 29.5.1912 у Бабруйску на рус. мове. Выдаўцы Ё.Е.Салавейчык, Б.Ё.Гінзбург; рэд. Я.Ё.Марголін, Б.Ё.Гінзбург. Газета змяшчала звесткі пра міжнар. і ўнутранае становішча, дзейнасць урада, Дзярж. думы Расіі і разнастайныя бакі мясц. жыцця, навук.-асветныя артыкулы, фельетоны, вершы і белетрыстыку, мела літ.-крытычны і тэатр. аддзелы. Адлюстроўвала эканам., паліт., сац.-культ. пазіцыю сярэдняй і дробнай гар. буржуазіі і інтэлігенцыі. Падтрымлівала ідэі культ.-нац. аўтаноміі народаў Расіі, але праблему нац. самавызначэння бел. народа амаль не закранала. Прапагандуючы маральна-філас. канцэпцыю Л.Талстога, газета захаплялася «культам талстоўства», бачыла ў пісьменніку «прарока» і «сумленне Расіі». З пазіцый крыт. рэалізму ацэньвала творчасць А.Пушкіна, Л.Андрэева, М.Горкага, А.Чэхава, Г.Ібсена і інш. рус. і зарубежных пісьменнікаў. Друкавала вершы, апавяданні, нарысы мясц. аўтараў, значнае месца адводзіла камерцыйнай рэкламе.

*У.М.Конан.*

**БО́БРЫК**, вёска ў Пінскім р-не, на р. Бобрык 1-ы. За 60 км на ПнУ ад г. Пінск, 235 км ад Брэста, 27 км ад чыг. ст. Малькавічы на лініі Ганцавічы—Лунінец, на аўтадарозе Ганцавічы—Лагішын. Цэнтр Бобрыкаўскага с/с. 177 гаспадарак, 407 ж. (2011).

Вядомы з 1559 як сяло ў Пінскім старостве Трокскага ваяв. ВКЛ. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі. З 1796 у Пінскім павеце Мінскай губ. У 1897 вёска ў Дабраслаўскай воласці, 47 двароў, 287 ж., піцейны дом, магазін. З 1921 у складзе Польшчы, у Дабраслаўскай гміне Лунінецкага, з 1922 Пінскага паветаў Палескага ваяв. З 1939 у БССР. З 15.1.1940 у Лагішынскім р-не Пінскай вобл. З 12.10.1940 цэнтр сельсавета. У Вял. Айч. вайну з пачатку ліп. 1941 да сярэдзіны ліп. 1944 Б. акупіраваны ням.-фаш. захопнікамі. З 8.1.1954 у Брэсцкай вобл., з 25.12.1962 у Пінскім р-не. У 1970 тут 172 двары, 698 ж.

У 2011 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, бальніца, амбулаторыя, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і «Беларусбанка», магазін. Помнік землякам, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну.

**БО́БЫШАЎ** Міхаіл Паўлавіч (19.11.1885, в. Пагарэлае Цвярской вобл., Расія — 7.7.1964), рускі тэатральны мастак, педагог. Нар. мастак Расіі (1961). Скончыў Вучылішча тэхн. малявання Штыгліца ў Пецярбургу (1907). Выкладаў у рас. ВНУ. У Дзярж. тэатры оперы і балета Беларусі афарміў оперу «Князь Ігар» А.Барадзіна (1934), балеты «Капелія» Л.Дэліба (1935), «Канёк-Гарбунок» Ц.Пуні (1936). Для створаных ім дэкарацый і касцюмаў характэрны тонкае пачуццё стылю, дэкар. графічнасць.

**БОГ** (слав. — той, хто надзяляе багаццем; старажытнаіранскае — гаспадар, лёс; старажытнаіндыйскае — удача, шчасце, той хто дарue; індыйскае — свяціць, ззяць), адно з ключавых рэлігійных паняццяў, звышнатуральная, духоўная субстанцыя або істота, якая з'яўляецца творцам і кіраўніком Сусвету, пачаткам і першапрычынай усяго быцця, сакральная персаніфікацыя Абсалюту і найвышэйшы розум. У монатэістычных рэлігіях Б. уяўляецца адзіным і спрадвечным, які існаваў яшчэ да стварэння Сусвету, у політэістычных — мноства багоў, іх можа быць некалькі пакаленняў. У пантэістычных уяўленнях Б. атаясамліваецца з прыродай і зліты з ёю ў адрозненне ад астатніх вучэнняў, дзе Б. з'яўляецца звышнатуральным. Ранні вобраз Б. — гэта родавае ці племяннoe бажаство, апякун роду ці племені. Пазней складаецца політэізм (шматбожжа), які стаў уплывовым на ранніх этапах развіцця бел. культуры. Шматбожжа перарадольваецца ў монатэізме (адзінабожжы), які ўласцівы *іудаізму*, *хрысціянству*, *ісламу*. Прыняцце хрысціянства прыводзіць да распаўсюджання монатэістычных уяўленняў у асяроддзі беларусаў. Уяўленні першабытных людзей пра звышнатуральныя істоты ў культу духаў былі не зусім выразныя. Паступова, па меры развіцця духоўнай культуры, гэтыя ўяўленні трансфармаваліся ў тую ці інш. разнавіднасць політэістычнай рэлігіі, дзе найб. архаічныя Б. ўяўляліся ў зааморфным ці антрапаморфным увасабленні. Напр., у зааморфным аблічны ўяўляўся шэраг Б. старaж.-егіпецкага пантэона, мелі анімалістычныя рысы некаторыя старaж.-грэч. Б., а таксама язычніцкія Б. славян. У політэістычных рэлігіях кожны з Б. быў «адказны» за пэўную частку прыроды, натуральнай стыхіі або сферу чалавечага жыцця (Б. нябесныя і зямныя, урадлівасці, кахання і шлюбу, вайны, замагільнага жыцця і г.д.). У язычніцкім пантэоне беларусаў напярэдадні прыняцця хрысціянства да гал. належалі Б. неба *Сварог*, Б. навальніцы і княжацкай улады *Пярун*, Б. жывёльнага свету, багацця, замагільнага свету, зямных вод *Вялес*. Да Б. больш нізкага ўзроўню адносіліся *Дажбог*, *Ярыла*, Сатвар, жаночыя божаствы *Лада*, *Мокаш* (Цёця), Лёля. Тагачасныя маральныя ўяўленні людзі пераносілі і на Б., з якімі звязваліся маральныя якасці і заганы. Па меры чалавечага прагрэсу фарміраваліся погляды пра адзінага Б., вярхоўную асобу, надзеленую найвышэйшым розумам, звышнатуральнай магутнасцю, несмяротнасцю і вечным існаваннем, усюдыіснасцю і ўсепранікальнасцю. Распрацоўка сістэматычных уяўленняў аб Б. з'яўляецца адной з задач тэалогіі. У традыцыях багаслоўскай і філас. думкі выпрацаваны 2 падыходы да фарміравання ўяўленняў аб Б. Адмоўны (сапафатычны) падыход грунтуецца на тым, што чалавечыя паняцці апісваюць рэальнасць зям-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нога свету і не могуць быць прыкладзены да Б., таму немагчыма што-небудзь ведаць ці сцвярджаць аб ім. Б. з'яўляецца інш. рэчаіснасцю, якую нельга спасцігнуць і апісаць. Станоўчы (катафатычны) падыход заключаецца ў распрацоўцы ўяўлення аб Б., у якім вызначаюцца ягоныя якасці (самабытнасць, нязменнасць, вечнасць, нязмернасць, усепрысутнасць, усёведанне, свабода, усесвятасць, усемагутнасць, усеправеднасць, усеблагасць). У адносінах да навакольнага свету і чалавека Б. з'яўляецца Стваральнікам, Уседзяржыцелем, Прамысліцелем, Выратавальнікам, Суддзёй і Мздаваздаяцелем. У сучасных філас. і тэалагічных дактрынах вылучаюцца такія якасці боскага быцця, як паўната і адзінкавасць, дасканалая духоўнасць і асабістае быццё, пазнанне, волез'яўленне і любоў. Важным аспектам у разуменні Б. з'яўляецца суаднясенне з матэрыяльным светам, сцвярджаецца ўяўленне аб неад'емнасці тварэння ад творцы, звязанасці вышэйшага і зямнога быцця.

У тэалогіі і філасофіі прыняты наступныя тэрміны для абазначэння форм разумення чалавекам Б.: тэізм — вера ў існаванне абсалютнага Б., які з'яўляецца ўсемагутнай, нічым не абмежаванай асобай, якая існуе вечна, стварыла свет і кіруе ім; пантэізм — атаясамліванне Б. і матэрыяльнага свету; дэізм — уяўленне пра Б. як архітэктара, які стварыў свет, але не тоесны яму; агнастыцызм сцвярджае, што адсутнічаюць доказы, якія дазваляюць станоўча ці адмоўна вырашыць пытанне аб існаванні Б.

З ідэяй Б. звязана ўяўленне, што акрамя свету і чалавека існуе патаемнае вымярэнне быцця. Ідэя Б. — сімвал таго, што перавышае чалавека і што найб. глыбока захавана ў ім. Б. сімвалізуе веды чалавека аб тым, што ён не адзін і не з'яўляецца канчатковым гаспадаром свайго лёсу. Асн. формамі сувязі з Б. з'яўляюцца малітва, рэліг. таінствы і абрады, імкненне да праведнага ладу жыцця. Непасрэдная крыніца богапазнання — свяшчэнныя тэксты.

На тэр. Беларусі вера ў адзінага Б. пачала ўсталёўвацца разам з прыняццем у канцы 10 ст. хрысціянства, якое на працягу некалькіх стагоддзяў паступова выцясняла язычніцкія політэістычныя вераванні.

У традыц. бел. грамадстве, мяркуючы па запісах фальклору 19 — пач. 20 ст., адчуванне Б. з'яўлялася натуральным, а нявер'е, ці бязбожнасць, выкарыстоўвалася ў праклёнах і лічылася адзнакай ізгояў, злачынцаў, уласцівасцю вар'яцтва і вышэйшай ступенню чалавечай ізаляцыі. Павага да Б. ў беларусаў выклікана не толькі верай у ягоную ўсемагутнасць і пачуццём страху перад «нябёснымі карамі», але і меркаваннямі маральнага кшталту. Божай прысутнасцю асвячаліся лепшыя нац. традыцыі, у т.л. гасціннасць («Госць у дом — Бог у дом»), працавітасць («Працуй, нябожа, то і Бог паможа»), спачуванне да ўдоў і сірот («Над сіратою — Бог з калітою»), перасцярога ад празмернай ганарлівасці за ўласныя поспехі і інш.

У бел. л-ры тэма Б. ўласціва творам Я.Купалы, К.Сваяка, М.Сяднёва, А.Разанава, Д.Бічэль-Загнетавай, Р.Барадуліна. У цяперашні час у Беларусі пасля перыяду панавання атэістычнай ідэалогіі вера ў Б. зноў становіцца істотным чыннікам грамадскай свядомасці і культуры.

*Літ.*: Мартинетти Дж. Человек, Бог, Вселенная. Милан; М., 1991; Данилов А.В. Единство и многообразие религии. Аналитическое религиоведение и теология диалога. Минск, 2004; Наука и богословие. Антропологическая перспектива. М., 2004; Полкинхорн Дж. Наука и богословие. Введение. М., 2004.

*Э.М.Зайкоўскі, В.Р.Языковіч.*

**БОГАСЛУЖЭ́БНЫЯ КНІ́ГІ**, кнігі, якія змяшчаюць тэксты, правілы і апісанне парадку богаслужэння. У праваслаўі па паходжанні раздзяляюцца на свяшчэнна- і царк.-богаслужэбныя. Да свяшчэнна-богаслужэбных адносяцца кнігі Свяшчэннага Пісання: Евангелле, Апостал, Псалтыр. Да царк.-богаслужэбных — кнігі, складзеныя на аснове Свяшчэннага Пісання: Служэбнік, Часаслоў, Актоіх, Тыпікон, Трыёдзь Посная і Цвятная (Святочная), Ірмалогій, Трэбнік. Асн. тыпы Б.к. славяне атрымалі з Візантыі. Канчаткова склаліся ў 2-й пал. 17 ст. пад уплывам выданняў Маскоўскага друкарскага двара. Асн. кніга свяшчэннаслужыцеляў (іерэяў і дыяканаў) — Служэбнік, дзе апублікаваны тэксты нязменных малітваслоўяў вячэрні, ютрані і літургіі. Пеўчыя і чытальнікі выкарыстоўваюць Часаслоў (уключае нязменныя малітваслоўі), Мінею, Актоіх, у Вял. пост — Трыёдзь Посную, у Пяцідзесятніцу — Трыёдзь Кветную (уключаюць зменныя малітваслоўі). Адны з самых ранніх богаслужэбных рукапісных кніг на тэр. Беларусі — Тураўскае евангелле 11 ст., Полацкае евангелле 12 ст., Аршанскае евангелле канца 12 — пач. 13 ст. Самыя раннія друкаваныя Б.к. на тэр. ВКЛ былі выдадзены Ф.Скарынам у Вільні (Псалтыр 1517, Шастадневец каля 1522, Апостал 1525). Кірылічныя выданні выйшлі ў Заблудаве (друкар І.Фёдараў), у Вільні (П.Мсціславец, В.Гарабурда, браты Мамонічы), Куцейне (С.Собаль), Магілёве (М.Вашчанка) і інш. Уніяцкія Б.к., як і праваслаўныя, друкаваліся ў Вільні і Супраслі. Гал. Б.к. ў каталіцтве для свяшчэннаслужыцеляў — Місал (змяшчае парадак богаслужэння — месы, а таксама ўстаўныя рубрыкі, каляндар), Лекцыянарый, Брэвіарый, для пеўчых і чытальнікаў — Градуал, Антыфанарый. На тэр. Беларусі каталіцкія лац. Б.к. ў асн. набываліся ў Цэнтр. і Зах. Еўропе (гал. чынам у Польшчы), друкавацца пачалі ў Вільні ў 17 ст. (Місал 1685 і 1778). У 17—18 ст. у бел. кляштарах ствараліся рукапісныя кнігі на лац. і польск. мовах (Градуалы, Антыфанарыі).

*Літ.*: Нікалаеў М.В. Палата кнігапісная. Мінск, 1993; Яго ж. Гісторыя беларускай кнігі. Т. 1. Мінск, 2009.

*Т.У.Салавей.*

**БО́ГІНСКАЯ ПАКРО́ЎСКАЯ ЦАРКВА́**, помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю ў в. Богіна Браслаўскага р-на. Пабудавана ў 1892 з цэглы на месцы папярэдняга храма. Да асн. прамавугольнага ў плане аб'ёму прымыкаюць бабінец, 5-гранная апсіда і 3-ярусная чацверыковая вежа-званіца з гранёным шатром і макаўкай у завяршэнні. Сцены расчлянёны арачнымі аконнымі пра-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ